*Да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў*

# Разведчыкі вярнуліся з задання

На ўскрайку мястэчка Пагост, у адным з будынкаў былой МТС, размяшчаўся гарнізон немцаў. У ім налічвалася да паўсотні актыўных штыкоў. На ўзбраенні немцы мелі кулямёты, аўтаматы і нават мінамёт. Жыхары навакольных вёсак скардзіліся на грабяжы і рэквізіцыі фашысцкай зграі. Патрэбна было пазбавіць насельніцтва ад здзекаў, а партызанскіх сувязных ад магчымасці папасці ў лапы крыважэрных катаў. Было вырашана будынак, дзе размяшчаўся гарнізон, узарваць і пад яго разваліны пахаваць карнікаў.

Вясной 1943 года разведчыкі 101-й брыгады імя Аляксандра Неўскага Іван Іванавіч Паўлаў і Даніла Аляксеевіч Міхаленя адправіліся на выкананне задання камандавання.

Стаяў той цудоўны вясенні час, калі прырода ажывала ад зімовай спячкі. Сонца ліло на зямлю яркія прамені. Зазелянелі сады. На лужках з'явілася мяккая траўка. У небе, над палямі, заліваліся жаўрукі. Прыгоркі ўпрыгожыліся першымі раннімі кветкамі.

А на гары хаты старасты Шпакоўскага з вёскі Залессе ўжо больш нядзелі сядзелі партызанскія разведчыкі. Даніла Міхаленя стаіць ля слухавога акенца і ўважліва аглядае вуліцу, а Іван Паўлаў прыслухоўваецца да таго, што творыцца ў хаце старасты. Адтуль даносяцца гартанныя выкрыкі і рогат.

— Спусціць бы па трубе адну лімонку, каб разнесла па куску гэтых сабак, — з гневам прамовіў разведчык Паўлаў.

— Не спяшайся, час прыйдзе, — суцяшае сябра Міхаленя.

Справы ішлі на лад. У партызанскіх разведчыкаў з'явіліся сябры. На спатканне часта прыходзілі мясцовыя жыхары Трываго, Біруля, Іван Янчык, Мікола Сяргіевіч. Актыўнасць праяўляў і падростак Найдзен. З дапамогай гэтай групы разведчыкі ўстанавілі сістэму аховы казармы, ведалі час змены вартавых, але пранікнуць унутр памяшкання не маглі. Будынак пільна ахоўваўся і днём, і ноччу.

Назіраючы за памяшканнем, разведчыкі ўстанавілі, што адзін з паліцэйскіх мае свабодны доступ у нямецкую казарму ў любы час дня. Вось яго і патрэбна было выкарыстаць для дасягнення мэты. Але як гэта зрабіць, ды ці згодзіцца ён на такі акт?

Устанавіць кантакт з паліцэйскім Іванам Новікам было даручана Бірулі і Янчыку. Гэтае заданне яны выканалі з гонарам, і неўзабаве адбылася першая гутарка разведчыкаў з паліцэйскім. Пасля нядоўгіх ваганняў Іван Новік згадзіўся занесці ў нямецкую казарму чамадан з толам.

Глыбокая ноч спусцілася на зямлю. На небе высыпалі зоркі. Здавалася, нішто не парушыць начную цішыню. Але калі стрэлкі гадзінніка паказалі дзве гадзіны ночы, зямля ўздрыгнула: вогненны слуп высока ўзняўся ў неба і асвятліў ваколіцы. Цагляны будынак рухнуў, апавясціўшы аб заканчэнні існавання гарнізона.

Праз дзень разведчыкі дакладвалі камандаванню брыгады аб выкананні чарговага задання. Да народных мсціўцаў з усёй сям'ёй прыйшоў і Іван Новік.

**В. КРУГЛІК.**

---

**У Чапялёўскай сярэдняй школе арганізаван духавы аркестр. Юныя аматары музыкі часта выступаюць перад хлебаробамі свайго і суседніх калгасаў.**